# Выбары 2024

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 20 лістапада ўказы нумар 367 “Аб назначэнні выбараў дэпутатаў” і нумар 368 “Аб назначэнні выбараў у Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь”.Гэтымі дакументамі ў адпаведнасці з патрабаваннямі Канстытуцыі прадугледжваецца правядзенне выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу восьмага склікання і мясцовыя Саветы дэпутатаў дваццаць дзевятага склікання ў адзіны дзень галасавання – **25 лютага 2024 года**, а ў Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу восьмага склікання – 4 красавіка 2024 года.Вылучэнне кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі мясцовымі Саветамі дэпутатаў, выканаўчымі і распарадчымі органамі павінна адбыцца не пазней за 21 сакавіка 2024 года.Падрабязную інфармацыю аб парадку правядзення выбараў можна даведацца на афіцыйным сайце **Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь**.**Звесткі аб складзе тэрытарыяльных і акруговых выбарчых камісій**.

